УДК 811.161.3

ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎСТВА І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СПЕЦЫФІЧНАСЦЬ АДЗІНАК ПРЫКАЗКАВАГА ФОНДУ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ[2]

Іваноў Яўген Яўгенавіч
загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Петрушэўская Юлія Анатольеўна
старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова;
магістр філалагічных навук
(г. Магілёў, Беларусь)

Статья посвящена изучению роли лингвострановедения в описании национально-культурной специфичности пословичного фонда белорусского языка. Проанализированы основные результаты лингвострановедческого изучения белорусских пословиц в 1994–2020 гг.

[2] Даследаванне выканана ў межах задання НДР "Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы (у еўрапейскім моўным кантэксце)» (ДР № 20161332) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства" на 2016–2020 гг.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Ключевые слова: пословица, белорусский язык, национально-культурная специфика, лингвострановедение.

The article discusses the role of cultural linguistics in the description of the national-cultural specificity of the proverbial fund of the Belarusian language. The main results of the linguocultural study of Belarusian proverbs in 1994–2020 have been analyzed.

Keywords: proverb, the Belarusian language, national-cultural specificity, linguocultural study.

Лінгвакраіназнаўства – гэта такі раздзел у тэорыі і практыцы выкладання і вывучэння мовы як замежнай (а таксама яшчэ і як няроднай – "другой ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму" [8]), у якім раскрываецца сувязь моўных адзінак з культурай, гісторыяй, побытам народа і ажыццяўляецца т. зв. "акультурацыя" – засвойванне тым, хто вырас у асяроддзі адной нацыянальнай культуры, асноўных фактаў і каштоўнасцей іншай нацыянальнай культуры [7, с. 33]. Асновы тэорыі і практыкі лінгвакраіназнаўства як уласна філалагічнай (пераважна лінгвістычнай) і як лінгвадыдактычнай дысцыпліны ўпершыню былі распрацаваны ў рускім мовазнаўстве [3; 4] пры стварэнні методыкі такога выкладання рускай мовы як замежнай, якое не абмяжоўваецца толькі "тэхнічным бокам" навучання мове (выпрацоўкай фанетычных і граматычных навыкаў), але арганічна ўключае ў сябе і вывучэнне рэалій нацыянальнай культуры народа, інфармацыя аб якіх змяшчаецца ў так званай "фонавай семантыцы" намінатыўных адзінак (слоў, фразеалагізмаў і моўных афарызмаў – прыказак і крылатых выразаў).

Прынцыпы лінгвакраіназнаўчага апісання нацыянальна-культурнай спецыфічнасці беларускіх прыказак упершыню ў беларускім мовазнаўстве былі распрацаваны ў 1990-х гг. [7; 9; 10] і рэалізаваны ў лінгвакраіназнаўчым дапаможніку "Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў" (1997) [5].

Беларускія прыказкі ў лінгвакраіназнаўчым плане адлюстроўваюць нацыянальную культуру, па-першае, як цэласныя моўныя знакі, па-другое, сваімі лексічнымі элементамі (што датычыцца назваў рэалій матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, жывёльнага і раслённага свету Беларусі, імёнаў людзей і геаграфічных назваў і г. д., якія згадваюцца ў прыказках), і па-трэцяе, сваімі "прататыпамі", паколькі генетычна свабодныя спалучэнні слоў самім сваім з'яўленнем (і далейшым замацаваннем у маўленні) былі абавязаны пэўным звычаям, традыцыям, своеасаблівасцям духоўнага свету і побыту беларусаў, гістарычным падзеям, што ў розныя часы адбываліся на Беларусі і інш. [7, с. 38–40].

Акрамя гэтага, безумоўную лінгвакраіназнаўчую каштоўнасць маюць і тыя прыказкі, якія з'яўляюцца агульнаўжывальнымі ў беларускай,

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

рускай, украінскай ці польскай мовах, а ў некаторых выпадках трапілі ў беларускую мову шляхам запазычання, але набылі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове нацыянальна-культурную афарбоўку паводле значэння або лексічнага складу. Параўн. *Вольнаму – воля, а шалёнаму – поле* і руск. *Вольному воля, спасённому рай* (з'яўленне другой часткі беларускай прыказкі мае глыбокія міфалагічныя карані ва ўсходнеславянскім фальклоры і тлумачыцца тым, што выхад "у поле" сімвалізуе выхад у свет смерці, а чалавек з неўнармаванай псіхікай у народным уяўленні таксама лічыўся прыналежным свету смерці) [5, с. 52]. "Актуалізацыя менавіта гэтых вобразаў у беларускім варыянце агульнага для ўсходнеславянскіх моў выразу *Вольнаму – воля* і складае нацыянальна-культурную адметнасць гэтай беларускай прыказкі" [7, с. 49].

Разам з тым трэба адзначыць, што лінгвакраіназнаўчае апісанне нацыянальна-культурнай спецыфічнасці беларускіх прыказак развіваецца недастаткова прадуктыўна і часта ажыццяўляецца адначасова з адпаведным апісаннем беларускай фразеалогіі [2], пераважна ў дачыненні да пэўнай мовы, найчасцей рускай [11; 12; 16] і інш. У адзінкавых працах распрацоўваюцца прынцыпы лінгвакраіназнаўчага апісання нацыянальна-культурнай семантыкі беларускай мовы [1; 6; 8].

Фактычна (г зн. паводле адбору моўнага матэрыялу) лінгвакраіназнаўчае апісанне нацыянальна-культурнай спецыфічнасці беларускіх прыказак грунтуецца ў асноўным на выніках яе этымалагічных, этналінгвістычных і лінгвакультуралагічных даследаванняў, таму аўтаматычна пераймае ўсе іх недакладнасці і памылкі [14]. Да таго ж, лінгвакраіназнаўчае апісанне пэўнай мовы можа мець сэнс і звычайна праводзіцца толькі ў дачыненні да нейкай адной іншай мовы, што натуральна прыводзіць да неапраўданага перабольшвання нацыянальнага за кошт іншанацыянальнага, спецыфічнага за кошт агульнага з тымі мовамі, якія застаюцца па-за межамі дадзенай пары моў [15].

Такім чынам, лінгвакраіназнаўчае апісанне беларускіх прыказак не можа выкарыстоўвацца ні як метадалагічная, ні як фактaлагічная падстава для вызначэння нацыянальна-культурнай спецыфічнасці адзінак прыказкавага фонду беларускай мовы [13].

Літаратура

1. Арцямёнак, Г. А. Беларускія лінгвакраіназнаўчыя і лінгвакультуралагічныя даведнікі: тыпы, змест, структура / Г. А. Арцямёнак, К. С. Півавар // Ученые записки УО "ВГУ имени П. М. Машерова". – 2017. – Т. 23. – С. 185–189.
2. Бухоўская, Я. Нацыянальна-культурны кампанент мовы ў беларускіх прыказках і прымаўках / Я. Бухоўская // Слова ў мове, маўленні, тэксце : зб.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

навук. арт. / пад рэд. Н. Р. Якубук. – Брэст : Альтэрнатыва, 2009. – Вып. 2. – С. 33–35.
3. Верещагин, Е. М. Лингвострановедческий план афористики / Е. М. Верещагин, В. Г. Костомаров // Язык и культура: лингвострановедение в преподавании русского языка как иностранного / Е. М. Верещагин, В. Г. Костомаров. – М. : Русский язык, 1976. – С. 162–195.
4. Верещагин, Е. М. Национально-культурная семантика языковых афоризмов / Е. М. Верещагин, В. Г. Костомаров // Язык и культура: лингвострановедение в преподавании русского языка как иностранного / Е. М. Верещагин, В. Г. Костомаров. – М. : Русский язык, 1990. – С. 71–80.
5. Іванова, С. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Іванова, Я. Іваноў. – Мінск : БФС, 1997. – 262 с.
6. Іванова, С. Ф. Лінгвакраіназнаўчае апісанне беларускай мовы / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў // Избранные научные труды ученых МГУ имени А. А. Кулешова / под ред. М. И. Вишневского. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2003. – С. 153–156.
7. Іваноў, Я. Я. Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы і праблема яе лінгвакраіназнаўчай рэпрэзентацыі (на матэрыяле моўнай афарыстыкі)|/ Я. Я. Іваноў // Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы) / Я. Я. Іваноў, С. Ф. Іванова, Н. Б. Мячкоўская. – Мінск : Веды, 1998. – С. 33–62.
8. Іваноў, Я. Я. Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы як аб'ект лінгвакраіназнаўства (пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай і як другой ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму) / Я. Я. Іваноў // Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы / рэдкал.: Г. Цыхун (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 285–290.
9. Іваноў, Я. Я. Нацыянальна-культурная семантыка беларускай моўнай афарыстыкі (лінгвакраіназнаўчы аспект) / Я. Я. Іваноў // Национально-культурный компонент в тексте и в языке : тез. докл. Междунар. науч. конф., 5–7 октября 1994 г. : в 2 ч. / редкол.: С. М. Прохорова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Універсітэцкае, 1994. – Ч. 2. – С. 55–57.
10. Іваноў, Я. Беларускія моўныя афарызмы і іх апісанне ў лінгвакраіназнаўчым слоўніку / Я. Іваноў // Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Іванова, Я. Іваноў. – Мінск : БФС, 1997. – С. 8–14.
11. Крупянкова, А. Лінгвакраіназнаўчы патэнцыял беларускай парэміялогіі (у дачыненні да рускай мовы) / А. Крупянкова // Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. – Białystok, 2002. – T. VIII. – S. 126–130.
12. Петрова, Н. П. Национально-культурная семантика белорусских фразеологизмов и пословиц (лингвострановедческий аспект) / Н. П. Петрова // Фразеология

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

германских, романских и славянских языков : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2009. – Вып. 1. – С. 250–255.
13. Петрушэўская, Ю. А. Нацыянальная адметнасць прыказкавага фонду беларускай мовы / Ю. А. Петрушэўская // Ученые записки УО “ВГУ имени П. М. Машерова”. – 2018. – Т. 27. – С. 150–154.
14. Петрушэўская, Ю. А. Вывучэнне нацыянальна-культурнага кампанента ў парэміялагічным фондзе беларускай мовы / Ю. А. Петрушэўская // Труды БГТУ. Сер. 4. – 2019. – № 1 (219). – С. 123–129.
15. Петрушэўская, Ю. А. Да праблемы вызначэння нацыянальнай адметнасці прыказкавага фонду беларускай мовы / Ю. А. Петрушэўская // Філалогічний часопис. – 2018. – Вип. 2 (12). – С. 70–75.
16. Пятрова, Н. П. Лінгвакраіназнаўчы аспект нацыянальна-культурнай семантыкі беларускіх фразеалагізмаў і прыказак / Н. П. Пятрова // Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2012. – С. 264–266.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова